# Ніводнага га перастою лёну

## Ільнаводныя раёны ганебна зацягваюць уборку тэхнічных

## Усім сакратаром РК КП(б)Б

Ня гледзячы на пасьпяваньне ільну і спрыяючыя ўмовы надвор'я ход церабленьня ільну зусім нездавальняючы. ЦК асабліва адзначае адставаньне ўборкі Сіроцінскага, Дрысенскага, Гарадоцкага, Сураскага, Дубровенскага раёнаў.

ЦК указвае, што кожны дзень спазьненьня з уборкай ільну павялічвае страты, зьніжае якасьць валакна.

ЦК абавязвае райкомы забясьпечыць уборку ільну раньняй жоўтай сьпеласьці, поўнасьцю скарыстаць машыны Гільштэйна і Эдзі. Скончыць будаўніцтва мачыльных ям. прыстасаваньне пунктаў перапрацоўкі да 20 жніўня, ліквідаваўшы разрыў паміж церабленьнем і наступнымі процэсамі апрацоўкі.

Мобілізуйце актыў раёну на ліквідацыю наяўных прарываў праз масавую работу, організацыю працы, організацыю соцыялістычнай узаемадапамогі і ліквідуйце адставаньне паасобных колгасаў.

Устанавеце штодзённую інформацыю колгасаў, саўгасаў у райком, забясьпечце прадстаўленьне опэрацыйных вестак Наркомзему.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч.
Наркомзем Масюкоў.